УДК 796.011:796.332-057.177.1 DOI 10.63874/2218-0273-2025-2-13-20

***Уладзімер Паўлавіч Люкевіч***
*канд. філас. навук, дац., дац. каф. спартыўных дысцыплін*
*Брэсцкага дзяржаўнага ўніверсітэта імя А. С. Пушкіна*
***Uladzimier Lukievic***
*Candidate of Philosophical Sciences, Associate Professor,*
*Associate Professor of the Department of Sports Disciplines*
*of Brest State A. S. Pushkin University*
e-mail: lucul@brsu.by

# ФІЛАСОФІЯ ФУТБОЛА. ПРЭЗІДЭНТЫ ФІФА. ЖУЛЬ РЫМЭ

*Працяг даследаванняў станаўлення, функцыянавання, развіцця і распаўсюджвання футбола на падставе фенаменалагічнага аналізу дзейнасці трэцяга прэзідэнта ФІФА – французскага юрыста Жуля Рымэ – дазваляе вызначыць галоўныя паступальныя накірункі ў прагрэсе гэтай глабальнай з'явы. Калі пасля напружанай палемікі з прадстаўнікамі Міжнароднага алімпійскага камітэта кампрамісу ў справе вырашэння важнейшых пытанняў дасягнуць не ўдалося, адбыўся відавочны падзел сфер уплыву паміж гэтымі дамінантнымі структурамі. Жуль Рымэ на пасадзе прэзідэнта ФІФА прадэманстраваў здаровыя амбіцыі ў ажыццяўленні працэсу прафесіяналізацыі, здолеў арганізаваць першы чэмпіянат свету па футболе, правёў сістэмную рэарганізацыю федэрацыі, прыцягнуў да супрацоўніцтва з ФІФА рэкордную колькасць краін. Зразумела, што не абышлося без праблем (перш за ўсё сацыяльна-эканамічнага і палітычнага характару), аднак Жуль Рымэ застаўся ў гісторыі футбола адным з самых крэатыўных яго дзеячаў.*

***Ключавыя словы:*** *Жуль Рымэ, спорт, футбол, ФІФА, чэмпіянат свету, тактыка, стратэгія, міжнароднае супрацоўніцтва.*

## *Philosophy of Football. FIFA Presidents. Jules Rimet*

*Continuing the study of the formation, functioning, development and spread of football based on the phenomenological analysis of the activities of the third FIFA president, the French lawyer Jules Rimet, allows us to determine the main progressive directions in the advancement of this global phenomenon. When, after intense debate with representatives of the International Olympic Committee, it was not possible to reach a compromise on the most important issues, an obvious division of spheres of influence between these dominant structures occurred. Jules Rimet, as FIFA president, demonstrated healthy ambitions in implementing the process of professionalization, managed to organize the first FIFA World Cup, carried out a systemic reorganization of the federation, and attracted a record number of countries to cooperate with FIFA. It is quite clear that there were some problematic situations, primarily of a socio-economic and political nature, but Jules Rimet remained one of the most creative figures in the history of football.*

***Key words:*** *Jules Rimet, sports, football, FIFA, World Cup, tactics, strategy, international cooperation.*

## Уводзіны

Пераўтварэнне футбола ў дамінантны сацыякультурны феномен у галіне спорту не абышлося без актыўнага ўдзелу аднаго з выбітных арганізатараў у гэтай галіне французскага функцыянера Жуля Рымэ (Jules Rimet, 1873–1956).

Ідэйны натхняльнік правядзення сусветных першынстваў па футболе быў прэзідэнтам галоўнага органа гэтай гульні самы працяглы перыяд – з 1921 па 1954 г., і яго смела можна назваць прыроджаным адміністратарам. Менавіта ён, самадзейная самадастатковая асоба і рэлігійны чалавек, дамінаваў у развіцці футбола на міжнародным узроўні. Калі Жуль Рымэ ўзначаліў Міжнародную федэрацыю футбола – ФІФА (FIFA, фр. Fédération Internationale de Football Association; анг. International Federation of Association Football), то практычна адразу пачаў лабіраваць ідэю правядзення чэмпіянату свету, пра што ў свой час выказаўся першы прэзідэнт гэтай арганізацыі, яго суайчыннік Рабэр Герэн (Robert Guérin, 1876–1952). Нягледзячы на складаны час – разбурэнні і нанесеныя Першай сусветнай вайной чалавечыя, палітычныя і эканамічныя страты, якія пакінулі глыбокі след у расколатай Еўропе, актыўную дзейнасць новай спартыўнай арганізацыі нельга было не заўважыць. Шмат у чым на яе прагрэс паўплываў працэс прафесіяналізацыі.

Як і шэраг яго суайчыннікаў, сярод якіх можна вылучыць постаці Рабэра Герэна і П'ера дэ Кубертэна (Pierre de Coubertin, 1863–1937), Жуль Рымэ лічыў, што спорт можа стаць сілай нацыянальнага і міжнароднага паяднання. Аднак у той жа час ён негатыўна ставіўся да развіцця кантынентальных канфедэрацый і пашырэння іх паўнамоцтваў у Афрыцы і Азіі і сцвярджаў пры гэтым, што дэцэнтралізацыя разбурыць Міжнародную федэрацыю футбола і што толькі непасрэднае членства захавае ФІФА як адну сям'ю [1; 2].

Калі ўважліва прасачыць за ступенямі жыццёвага шляху Жуля Рымэ, то можна заўважыць, што яго біяграфія адлюстроўвае ўласныя перакананні ў сацыяльнай справядлівасці, дэмакратычнасці і міратворчай ролі футбола. Для яго дылема «гульня – сур'ёзнае», паводле Ёхана Хейзінгі, азначае не што іншае, як інструмент адукацыі, аб'яднання людзей, напрыклад, супраць вайны. Урэшце, гульня ў футбол паўстае як паўнавартасная працоўная дзейнасць. Усё гэта неад'емна звязана з філасофіяй футбола як сімвала чалавечых каштоўнасцей. Уся дзейнасць Жуля Рымэ, усе яго погляды базіруюцца на тым, што феномен гульні будуецца не толькі (і не столькі) на тактыка-тэхнічных аспектах, але перш за ўсё на ідэях справядлівасці, інклюзіўнасці, міжнароднага супрацоўніцтва, што дазваляе больш глыбока зразумець гэтую з'яву, а этапы яго біяграфіі дазваляюць лепш усвядоміць генезіс станаўлення філасофіі футбола як спорта з глыбокай сацыяльнай і культурнай місіяй. Да таго ж Жуль Рымэ быў прадстаўніком гуманістычных і ідэалістычных колаў, яго рэлігійныя і сацыяльныя перакананні базіраваліся на тым, што футбол павінен стаць сродкам аб'яднання людзей розных класаў і нацый. Яго біяграфія непарыўна звязана са стварэннем грандыёзнага сусветнага праекта – правядзеннем чэмпіянату свету па футболе, іншымі словамі, рэалізацыяй ідэі міру праз спорт.

***Мэта працы.*** Аўтар працягвае даследаванне ўзнікнення, станаўлення, фарміравання, функцыянавання і распаўсюджвання феномена сучаснага спорту на падставе аналітычнай рэфлексіі аднаго з найбольш папулярных яго відаў – футбола [3; 4]. Згодна з асаблівасцямі перцэпцыйнага ўспрымання прасочваецца здольнасць суб'екта да вырашэння супярэчнасцяў як унутранага, так і знешняга плана, а таксама пераасэнсаванне сітуацыі і пошукаў новага кантэксту праблемы. У рамках акрэсленай матрыцы на падставе дэскрыптыўнага падыходу маецца на мэце зрабіць фенаменалагічны аналіз дзейнасці трэцяга прэзідэнта ФІФА Жуля Рымэ па развіцці футбола і ўвасабленні ў сацыяльную рэчаіснасць новай метадалогіі па інтэнсіфікацыі працэсаў распаўсюджвання гэтай гульні, якая грунтуецца на прынцыпах гуманістычнай філасофіі па ўсім свеце. Аўтар акцэнтуе ўвагу яшчэ і на тым, што паняцце «філасофія футбола» базіруецца таксама на некаторых вызначальных паняццях, якія акрэсліваюць глыбіннае разуменне гульні не толькі як уласна спорту, а як складанай сістэмы ўзаемадзеяння, прыняцця рашэнняў і каштоўнасцей. Футбол разглядаецца як гульня прасторы і часу і не зводзіцца толькі да фізічнай актыўнасці.

**Асноўная частка**

Даследаванні, што звязаны з філасофскай фенаменалогіяй, маюць складанасці з пункту гледжання рэтраспектыўнай рэфлексіі. Таму выкарыстанне інструментарыю Reflection Analytics дазваляе больш-менш дакладна вызначыцца з арыентацыяй на рэйтынгавае размяшчэнне аб'екта даследаванняў і яго ўплыву на грамадства. Увага пераважна надаецца тым сацыяльным каштоўнасцям, якія ўплываюць на захаванне гуманістычных ідэалаў і адмаўляюць, напрыклад, залежнасць ад рознага роду дэвіяцый. Аднак не ігнаруюцца таксама такія метады вывучэння, як назіранне, апісанне, параўнанне, аналіз, інтэрпрэтацыя і экстрапаляцыя навуковых дадзеных, факталогія з публіцыстычных і дакументальных крыніц. Важным аспектам у падрыхтоўцы матэрыялу выявілася выкарыстанне і крытычнае ўспрыманне адкрытай у доступе інтэрнэт-інфармацыі. У цэлым такі падыход дазваляе зрабіць адпаведныя высновы ў вызначаным накірунку.

Нельга казаць, што імя Жуля Рымэ было малавядомым у еўрапейскім футбольным асяроддзі. Напрыклад, ён удзельнічаў у 11-м Кангрэсе ФІФА ў нарвежскай Крысціяніі (Осла) у 1914 г. у якасці прадстаўніка Французскага футбольнага саюза. Там, дарэчы, дакладна прагучала прапанова, што пры ўмове правядзення алімпійскага турніру ў адпаведнасці з рэгламентам Фут-

больнай федэрацыі ён прызнаецца чэмпіянатам свету сярод аматараў. Такі падыход забяспечваў магчымасці арганізацыі ўласных спаборніцтваў, і ФІФА была гатова да таго, каб цалкам узяць на сябе адказнасць за арганізацыю футбольнага турніру [5].

Абранне Жуля Рымэ на пасаду прэзідэнта ФІФА ў 1921 г. дало моцны імпульс развіццю самой арганізацыі, што было неабходна зрабіць, каб пазбавіцца залежнасці ад МАК (Міжнародны алімпійскі камітэт, англ. IOC, International Olympic Committee). Амбіцыйны Рымэ кіраваўся ідэяй заснаваць такое спаборніцтва, якое б праводзілася выключна ФІФА, прэзентавала футбол на ўсім свеце і аб'ядноўвала яго.

Знакавая падзея адбылася на 17-м Кангрэсе ФІФА ў Амстэрдаме 28 мая 1928 г., дзе было абвешчана пра надзвычайную прапанову Міжнароднай федэрацыі футбола, а менавіта аб правядзенні ўласнага чэмпіянату свету.

Дэлегаты пагадзіліся з інфармацыйным паведамленнем, а пасля таго, як Уругвай гарантаваў аплату ўсіх выдаткаў на праезд, менавіта алімпійскія чэмпіёны былі выбраны гаспадарамі першага турніру 1930 г. Праўда, гэтае рашэнне сустрэла не толькі ўхваленне: Еўропа знаходзілася ў самым разгары эканамічнага крызісу. Для еўрапейцаў удзел у чэмпіянаце свету быў не толькі працяглым марскім падарожжам: клубы павінны былі б адмовіцца ад сваіх лепшых ігракоў на два месяцы. Усё больш і больш асацыяцый парушалі сваё абяцанне прыняць удзел і тым самым ставілі пад сур'ёзную пагрозу арганізацыю спаборніцтваў. У выніку з Еўропы на чэмпіянат свету 1930 г. адправіліся Францыя, Бельгія, Румынія і Югаславія. Але, нягледзячы на апазіцыйныя настроі шэрага прадстаўнкоў футбольнай супольнасці, турнір урэшце быў праведзены, як планавалася, і ён меў вялікі поспех.

Як падкрэслівае Ларэнца Д'Амада (Lorenzo D'Amado) з парыжскага ўніверсітэта Сарбона Нувель, выбар Уругвая – краіны з насельніцтвам, крыху большым за два мільёны жыхароў, – можа падавацца даволі дзіўным, асабліва калі прыняць пад увагу патрабаванні да прэтэндэнтаў на правядзенне чэмпіянату свету. Што ж у такім разе забяспечыла перавагу паўднёваамерыканцаў? Перш за ўсё гэта былі дзяржаўныя гарантыі пакрыцця выдаткаў на праезд спартыўных дэлегацый у першым класе, пражыванне дваццаці ігракоў падчас іх знаходжання на спаборніцтвах, аплата яшчэ васьмі дадатковых дзён, а таксама кампенсацыя заробкаў у памеры двух песа ў дзень у падарожжы і чатырох песа ў дзень побыту ў Мантэвідэа. Дадаткова ўлічылі перамогі каманды Уругвая на дзвюх апошніх Алімпіядах, бурнае развіццё футбола ў Паўднёвай Амерыцы, святкаванне стагоддзя палітычнай незалежнасці Уругвая, падтрымка з боку суседскіх асацыяцый [6].

Першы чэмпіянат свету, нягледзячы на ўсе прэвентыўныя меры, выявіўся даволі небяспечным мерапрыемствам, калі браць пад увагу ахову грамадскага парадку, бо шмат якія заўзятары прыходзілі на гульні ўзброенымі. Не менш нервова прайшло і наступнае сусветнае першынство ў Італіі ў 1934 г. Фактычна яно стала сімвалам фашысцкага рэжыму і шмат у чым паўплывала на тое, што Жуль Рымэ за свае сувязі з нацыстамі так і не атрымаў Нобелеўскай прэміі (у 1956 г. ён быў сярод намінантаў на ўзнагароду ў галіне міру) [7].

Да гэтага часу спецыялісты і аматары спорту ўзгадваюць пра палеміку Жуля Рымэ з П'ерам дэ Кубертэнам. Першы з іх быў неадступным прыхільнікам прафесіяналізацыі футбола, другі, як вядома, заставаўся на баку спартыўнага аматарства і, акрамя таго, быў праціўнікам міжнародных футбольных турніраў. З пункту сучаснага гледжання можна зразумець пазіцыі кожнага з іх. ФІФА, якая набірала сілу і міжнароднае прызнанне, паўставала ў якасці аднаго з канкурэнтаў алімпійскага руху і мэтанакіравана ішла да свайго адзінаасобнага панавання. Для МАК футбол заставаўся своеасаблівай «разыначкай» сярод іншых відаў спорту, і, зразумела, не хацелася яго губляць [8; 9].

Канфлікт паміж двума лідарамі сусветнага спорту знайшоў сваё лагічнае завяршэнне ў тым, што Жуль Рымэ жорстка і рашуча паведаміў пра нязгоду заставацца пад уплывам МАК. На яго думку, футбол павінен быць прафесійным, за ўдзел у гульнях неабходна плаціць як за любую працу. Знакамітае кубертэнаўскае «О спорт, ты мір!» знайшло свой працяг: «Але толькі для невялікай купкі абраных…».

На ўзроўні перцэпцыйнай рэфлексіі спорт як від сацыяльнай дзейнасці інтэрпрэтаваўся з пункту гледжання аматарства

і прафесіяналізму: з аднаго боку, арыстакратычнай асобай, для якой спорт не з'яўляецца сродкам чалавечай жыццёвай дзейнасці, а з другога – чалавекам, які ўзняўся з больш нізкіх сацыяльных прыступак і які мяркуе, што спорт павінен прыносіць прыбытак за тыя фізічныя і духоўныя намаганні, на якіх уласна і базіруецца. У выніку пасля працяглых і нервовых перамоў стала зразумела, што дзве арганізацыі не змогуць дамовіцца. Каб зразумець пазіцыю ФІФА, спатрэбілася некалькі дзесяцігоддзяў, пакуль алімпійскі рух не ўзначаліў Хуан Антоніа Самаранч (Juan Antonio Samaranch, 1920–2010).

Жуль Рымэ быў аўтарам яшчэ адной наватарскай ідэі. Менавіта з яго прапановы паўстаў камандны Кубак для чэмпіёнаў свету па футболе, які яшчэ часта называюць «Залатая багіня». Прыз быў выраблены французскім скульптарам Абелем Лафлерам (Abel Lafleur, 1875–1953) па заказе ФІФА, які ў якасці мадэлі абраў міфічную крылатую багіню Ніку, што трымае на выцягнутых руках чашу. Гэтая ўзнагарода была ў полі зроку і крымінальных элементаў, некалькі разоў яе скрадалі. З 1974 г. галоўная ўзнагарода атрымала назву «Трафей чэмпіянату свету па футболе» [10]. Зараз пераможцы ўзнагароджваюцца шэдэўральным творам італьянскага мастака Сільвіё Гацанігі (Silvio Gazzaniga, 1921–2016) [11].

Зразумела, што не ўсё адбывалася згодна з запланаваным. Так, перад Алімпійскімі гульнямі 1932 г. у Лос-Анджэлесе ў Міжнародным алімпійскім камітэце не змаглі вызначыцца адносна аматарскага статусу футбалістаў. У адказ ФІФА вырашыла не ладзіць Алімпійскі футбольны турнір. У 1934 г. правядзенне турніру шмат у чым было азмрочана фашысцкай дыктатурай у Італіі, а яшчэ праз чатыры гады спаборніцтвы сутыкнуліся з палітычнымі праблемамі, у выніку чаго арганізатары пазбавіліся прадстаўнікоў Аргенціны, Аўстрыі і Уругвая. Далей у выніку Другой сусветнай вайны правядзенне чэмпіянатаў стала немагчымым да 1950 г.

Між тым у 1946 г. чатыры брытанскія асацыяцыі вярнуліся ў ФІФА. Гэта адбылося зноў жа дзякуючы дыпламатычнаму таленту Жуля Рымэ, які знайшоў у асобах Артура Друры (Arthur Drewry, 1891–1961) і сэра Стэнлі Роўза (Stanley Rous, 1895–1986) (у далейшым пятага і шостага прэзідэнтаў ФІФА адпаведна) трывалых партнёраў. Больш за тое, гэтая падзея праз год была адзначана т. зв. «матчам стагоддзя» паміж Вялікабрытаніяй і «астатняй Еўропай» у Глазга ў прысутнасці 135 тыс. гледачоў. Прыбытак ад гульні склаў 5 тыс. фунтаў, і гэтая сума была перададзена ў распараджэнне Міжнароднай федэрацыі футбола, каб дапамагчы ёй пераадолець фінансавыя цяжкасці, якія былі выкліканы наступствамі ваенных гадоў [12].

Калі Рымэ ўзначаліў ФІФА ў гады яе станаўлення, ён паставіў перад сабой мэту стварыць сусветную футбольную сям'ю. Але яму было цяжка пазбавіцца перадузятасці прадстаўнікоў шэрага футбольных федэрацый Еўропы, якія па-снабісцку, як і раней, ставіліся да паўднёваамерыканскіх членаў міжнароднай супольнасці.

Каб зрабіць неяк больш лагоднымі трансатлантычныя адносіны, у сакавіку 1939 г. на Кангрэсе Паўднёваамерыканскай канфедэрацыі ў Буэнас-Айрэсе Жуль Рымэ адхіліў прэтэнзіі на еўрапацэнтрызм, бо неаднойчы быў вымушаны адказваць на нязручныя пытанні, асабліва з боку Уругвая [13]. Толькі ў канцы яго прэзідэнцтва і пашырэння паўнамоцтваў адпаведныя кантынентальныя структуры былі створаны для Еўропы, Афрыкі, Азіі, Акіяніі, Паўночнай і Цэнтральнай Амерыкі і Карыбскага басейна. Гэтыя змяненні былі растлумачаны на Кангрэсе ФІФА ў Рыа-дэ-Жанэйра ў 1950 г., калі было абвешчана, што паступальнае станаўленне і функцыянаванне арганізацыі магчыма на падставе фарміравання лепшых чалавечых якасцей, якія могуць надаць спорту ўвогуле і футболу ў прыватнасці: вернасць духу гульні, умеранасць у канкурэнцыі і спартыўным саперніцтве, салідарнасць у клубах. Такім чынам, усеагульная філасофія каштоўнасцей увабрала ў сябе сусветнае адзінства футбола, а галоўная мэта ФІФА стала фактам: адзінства як маральнае, так і матэрыяльнае стала дамінантай стратэгіі далейшага развіцця [1].

У цэлым крэатыўная роля Жуля Рымэ па арганізацыі і структурным развіцці міжнароднага футбола выявілася ў наступных палажэннях.

Па-першае, падчас свайго прэзідэнцтва яму ўдалося сфарміраваць трывалы фундамент, які стварыў падставы правядзення буйнейшага і самага прэстыжнага турніру на свеце, а менавіта чэмпіянату

1930 г. ва Уругваі, што стала найважнейшым крокам у структурызаванні футбола і аб’яднанні нацый за пасярэдніцтвам спорту. Па-другое, ён паслядоўна праводзіў да рэалізацыі сваю схільнасць да прафесіяналізацыі гульні, даступнасці да яе прадстаўнікоў усіх сацыяльных слаёў без абмежаванняў, і гэта відавочна адрознівала яго ад шэрага функцыянераў, якія арыентаваліся на арыстакратычныя мадэлі спорта і аматарскі статус. Па-трэцяе, дзякуючы сваім камунікацыйным здольнасцям ён правёў бліскучую серыю перамоў з прадстаўнікамі футбольных федэрацый розных краін, у выніку чаго колькасць членаў ФІФА дасягнула 85.

Нельга не заўважыць, што, акрамя арганізацыйных дасягненняў, Жуль Рымэ зрабіў значны ідэалагічны ўклад. Ён лічыў, што спорт, і футбол у першую чаргу, з’яўляецца ўзорам ідэі міру і ўзаемапаразумення паміж народамі, што дае магчымасць трактаваць футбольныя спаборніцтвы як сацыяльна-філасофскі праект, дзе спалучаюцца не толькі арганізацыйная кампетэнтнасць, але і гуманістычныя і дэмакратычныя спартыўныя ідэалы. Футбол пры такім падыходзе ўспрымаецца як сацыякультурны феномен.

Пад кіраўніцтвам Рымэ Міжнародная федэрацыя футбола паступова стандартызавала правілы гульні, пашырыла геаграфію сваёй прысутнасці і ўмацавала міжнароднае супрацоўніцтва. Прэзідэнт ФІФА змог вырашыць праблему супрацьстаяння з кіраўніцтвам МАК па лініі «прафесіяналы – аматары», а правядзенне чэмпіянатаў свету не залежала ад Алімпійскіх гульняў.

Больш дакладна крэатыўная роля Жуля Рымэ ў арганізацыі і структурным развіцці міжнароднага футбола заключаецца ў шэрагу наступных важных дасягненняў:

1) спрыянне ў павелічэнні колькасці членаў ФІФА шляхам аб’яднання футбольных федэрацый розных краін, што стала падставай стварэння структуры для правядзення рэгулярных міжнародных турніраў;

2) дэмакратызацыя і прафесіяналізацыя футбола, стварэнне варункаў доступу да гульні шырокіх колаў насельніцтва, фарміраванне міжнароднай супольнасці аматараў футбола;

3) апора на гуманістычныя ідэалы ў сістэме спартыўнай дзейнасці, падкрэсленне ролі футбола як інструмента міру, сяброўства і ўзаемапаразумення паміж народамі;

4) фарміраванне інстытуцыйнай базы, распаўсюджванне ідэй масавага і прафесійнага футбола, стварэнне буйнейшых міжнародных спаборніцтваў, якія карэнным чынам змянілі развіццё сусветнага футбола.

Каб зразумець тыя інтэнцыі, якія натхнялі Жуля Рымэ ў рэалізацыі галоўнай справы свайго жыцця, неабходна таксама засяродзіцца на сацыяльна-філасофскіх аспектах яго дзейнасці. Напачатку трэба ўзгадаць палеміку з П’ерам дэ Кубертэнам па сутнасці самога спорту і адпаведнай спартыўнай дзейнасці. П’ер дэ Кубертэн, заснавальнік канцэпцыі сучаснага алімпізму, паслядоўна прытрымліваўся традыцый старажытнагрэчаскай філасофіі і пераносіў гэтую матрыцу на рэаліі капіталістычнага грамадства. На яго думку, заняткі спортам павінны былі б прыносіць кожнай асобе эстэтычнае задавальненне ад фізічных практыкаванняў і адбывацца на падставе адпаведных маральных каштоўнасцей, прычым да ўдзелу ў спаборніцтвах дапускаліся толькі такія атлеты, для якіх такія заняткі выглядалі пераважна як баўленне вольнага часу і не ставілі на мэце матэрыяльнае ўзнагароджанне. Рымэ рэзка аспрэчваў такі падыход і ў адказ на элітарную канцэпцыю спорту, якая будавалася на арыстакратычных прынцыпах алімпізму, прытрымліваўся іншых поглядаў: спорт – гэта не толькі спосаб фізічнага выхавання, але і сродак сацыяльнай мабільнасці, роўнасці і пашырэння грамадзянскіх правоў. Яго каштоўнасць у масавасці, даступнасці і прафесіяналізме для кожнай асобы без абмежаванняў. Такі падыход цесна звязаны з філасофіяй гуманізму і дэмакратызацыяй грамадскага жыцця. Іншымі словамі, спорт выяўляецца як прастора дэмакратыі, інклюзіі, інтэграцыі і мірнага ўзаемадзеяння людзей, што можна лічыць сацыяльна-філасофскімі падставамі сучаснага спорту. Такое меркаванне склалася пад уплывам разбуральных вынікаў Другой сусветнай вайны, калі ішлі пошукі такога інструмента аб’яднання людзей розных нацыянальнасцей, рэлігій, класаў і культур. Менавіта ў футболе Жуль Рымэ бачыў механізм, які мог бы згасіць вострыя нацыяналістычныя супярэчнасці і агрэсіўнасць. На яго думку, менавіта ў працэсе спартыўнай дзейнасці ёсць магчымасць выпрацаваць універсальную мову для ўзаемапаразумення, пераадолець сацыяльныя бар’еры, сфарміраваць асяроддзе для міжкультур-

нага дыялогу, дзе кожная асоба незалежна ад паходжання і статусу будзе адчуваць сябе часткай супольнасці. Аналіз яго дзейнасці дэманструе намаганні ў рэалізацыі ідэі масавага спорту, дзе футбол выступае ў якасці бясспрэчнага дамінавання з тым, каб пазбавіцца тэндэнцый элітарнасці і быць даступным для рабочых, моладзі, прадстаўнікоў сацыяльных меншасцей, а ў больш шырокім разуменні – ператварыцца ў глабальны механізм інтэграцыі, супрацоўніцтва і ўзаемапаразумення паміж народамі. Неабходна таксама прыняць да ўвагі, што пасля Першай сусветнай вайны Еўропа ўжо перажывала крызіс ідэнтычнасці і змагалася з ростам нацыяналізму, і якраз міжнародныя спартыўныя спаборніцтвы былі адным з інструментаў анігіляцыі канфліктаў. Таму ініцыятыва правядзення, напрыклад, чэмпіянатаў свету па футболе можа інтэрпрэтавацца як сацыяльна-філасофскі праект інтэграцыі чалавецтва.

Увогуле можна канстатаваць, што сацыяльна-філасофскія аспекты дзейнасці Жуля Рымэ базіруюцца на рэалізацыі спорта як сродка чалавечай інтэграцыі, фарміравання справядлівага і салідарнага грамадства, дзе спорт паўстае як адзін з найважнейшых элементаў культурнага і маральнага развіцця.

**Заключэнне**

Да гэтага часу лічыцца, што Жуль Рымэ быў самым эфектыўным прэзідэнтам у гісторыі гэтай арганізацыі. Пад канец яго кіраўніцтва ФІФА налічвала ўжо 85 сваіх членаў. Да прыкладу, цяпер яе членамі з’яўляюцца 211 асацыяцый (у склад Арганізацыі Аб’яднаных Нацый уваходзяць 193 краіны).

На пачатку прэзідэнцтва тады яшчэ 48-гадовага француза ў 1921 г. толькі 20 нацыянальных футбольных федэрацый выявілі сваю зацікаўленасць у супрацоўніцтве. Няпростая сітуацыя абцяжарвалася палітычным і сацыяльна-эканамічным крызісам пасля заканчэння Першай сусветнай вайны. На час кіраўніцтва Жуля Рымэ прыпалі разбуральныя наступствы Першай і Другой сусветных войнаў, якія не давалі аптымістычных падстаў для далейшага развіцця. Да таго ж мноства папрокаў ён атрымаў за асабістую тактыка-стратэгічную дзейнасць, калі ў сваёй прапагандзе футбола не бачыў розніцы паміж дэмакратамі і тыранамі, абаронцамі правоў чалавека і ваеннымі злачынцамі, што ў значнай меры не дазволіла яму атрымаць узнагароду Нобеля. Асабліва яго крытыкавалі за тое, што ён пагадзіўся на палітызаванае правядзенне чэмпіянату свету 1934 г. у фашысцкай Італіі, калі яе кіраўнік Беніта Мусаліні (Benito Mussolini, 1883–1945) выкарыстаў папулярнасць турніру для прапаганды фашызму [14].

Жуль Рымэ заставаўся цвёрдым прыхільнікам таго, што спорт аб’ядноўвае ўсе дзяржавы значна мацней, чым любая палітычная арганізацыя. Дэвіз Французскай Рэспублікі «Свабода. Роўнасць. Братэрства» ён перанёс на футбольнае поле з імкненнем да захавання правілаў сумленнай гульні і ўзаемапавагі нават паміж непрымірымымі сапернікамі [15].

Ітак, асноўныя сацыяльна-філасофскія аспекты дзейнасці Жуля Рымэ заключаюцца ў наступным:

1) спорт у цэлым (і футбол у прыватнасці) трактуецца як магутны сацыяльны інстытут, які здольны сфарміраваць інклюзіўную грамадзянскую супольнасць;

2) спорт у цэлым (і футбол у прыватнасці) з’яўляецца падставай аб’яднання людзей розных нацыянальнасцей, сацыяльных колаў, культур і рэлігій і стварае пры гэтым новыя формы інтэграцыі і ўзаемапаразумення;

3) гуманістычны падыход да канцэптуальных палажэнняў філасофіі футбола ў шырокім сэнсе як сацыякультурнага фенамена;

4) фарміраванне грамадзянскай адказнасці і адпаведных маральна-этычных каштоўнасцей;

5) рэалізацыя ідэі чэмпіянату свету па футболе як сацыяльна-філасофскага праекта, накіраванага на ўмацаванне міру і дыялогу паміж народамі.

Такім чынам, спорт застаецца адлюстраваннем дэмакратычных тэндэнцый у развіцці грамадства; ён не толькі супрацьпастаўляецца элітарным ідэалам, але становіцца важным інструментам культурнага і маральнага прагрэсу.

Вынікі праведзенага даследавання на падставе суб’ектыўнай перцэпцыі даюць магчымасць выкарыстаць прадстаўлены матэрыял як элементную частку фармаўтваральнага складальніка парадыгмальнага характару ў функцыянаванні і развіцці аднаго з дамінантных відаў сучаснага спорту – футбола. Такі падыход дазваляе сканцэн-

травацьасноўную ўвагу на ролі асобы ў арганізацыі, станаўленні і распаўсюджванні глабальнага сацыяльна-культурнага феномена футбола, які дэманструе татальныя здольнасці да ўзаемасупрацоўніцтва з іншымі грамадскімі з’явамі. Выяўленыя гістарычныя тэндэнцыі і навацыі сведчаць пра няспынную цікавасць шырокіх колаў публічнасці да гэтага спецыфічнага віду сацыяльнай актыўнасці, якім, без сумненняў, з’яўляецца футбол, і гэта яшчэ раз падкрэслівае думку, што калі нейкая з’ява прыцягвае ўвагу сотняў мільёнаў людзей, то яна абавязкова патрабуе адпаведнага філасофскага асэнсавання.

Аналіз і сістэматызацыя дзейнасці Жуля Рымэ на пасадзе прэзідэнта ФІФА дазваляюць зрабіць адпаведныя высновы на падставе як паспяховых, так і няўдалых яго рашэнняў і памкненняў. Гэта мае пэўнае значэнне для спецыялістаў у галіне футбола, гісторыкаў спорту, кіраўнікоў адпаведных арганізацыйных структур рознага ўзроўню па фарміраванні сістэмы паспяховай дзейнасці.

Зразумела, што не ўсе аўтарскія падыходы і заключэнні могуць падавацца бясспрэчнымі. Палеміка адносна сацыяльна-філасофскай праблематыкі, якая вядзецца пра месца і ролю футбола ў культурнай парадыгме грамадства, мае свае асаблівасці. Але разам з тым кожны наступны гістарычны перыяд у развіцці футбола дэманструе устаноўчую паступальную дынаміку і колькаснае павелічэнне зацікаўленых гэтай гульнёй, што таксама не можа застацца без адпаведнага філасофскага асэнсавання.

СПІСАК ВЫКАРЫСТАНЫХ КРЫНІЦ

1. Jules Rimet (1873–1956) : Quick Reference. – URL: https://www.oxfordreference.com/-display/10.1093/oi/authority.20110803100421729 (date of access: 04.01.2025).

2. Pioneers of Sport: Jules Rimet. – URL: https://admiralsports.com/blogs/journal/pioneers-of-sport-jules-rimet?srsltid=AfmBOopCku7HtbG3X6BN2VzhxWep_cnCkMv40m2kLwTy-bKOhSC-kogK9 (date of access: 04.01.2025).

3. Люкевіч, У. П. Філасофія футбола. Прэзідэнты ФІФА. Дэніэл Вулфал / У. П. Люкевіч // Веснік Брэсцкага ўніверсітэта. Серыя 1, Філасофія. Паліталогія. Сацыялогія. – 2024. – № 2. – С. 20–26.

4. Люкевіч, У. П. Філасофія футбола. Прэзідэнты ФІФА. Рабэр Герэн / У. П. Люкевіч // Ценности, традиции и новации современного спорта : материалы III Междунар. науч. конгр., Минск, 14–15 нояб. 2024 г. : в 3 ч. / Белорус. гос. ун-т физ. культуры ; редкол.: С. Б. Репкин (гл. ред.), Т. А. Морозевич-Шилюк (зам. гл. ред.) [и др.]. – Минск : БГУФК, 2024. – Ч. 3. – С. 245–250.

5. Father of the World Cup. – URL: https://we.sflep.com/kewei/readingdetail.aspx?id=15112 (date of access: 05.01.2025).

6. D’Amado, L. Montevideo 1930: reassessing the selection of the first World Cup host / L. D’Amado. – URL: https://www.academia.edu/43630610/Montevideo_1930_reassessing_the_-selection_of_the_first_World_Cup_host (date of access: 05.01.2025).

7. Риме Жюль. – URL: https://bigenc.ru/c/rime-zhiul-a9f696 (дата обращения: 07.01.2025).

8. Жюль Риме и его вклад в развитие футбола. – URL: https://dzen.ru/a/ZJGHn_zsmg-UPiZh2 (дата обращения: 07.01.2024).

9. Dietschy, P. Making football global? FIFA, Europe, and the non-European football world, 1912–74 / P. Dietschy // Journal of Global History. – 2013. – Vol. 8, iss. 2. – P. 279–298.

10. Печальный итог истории футбольного Кубка Жюля Риме – был спасен во время войны и бесследно исчез в мирное время... – URL: https://dzen.ru/a/ZWid_Hh3Okg64LYT (дата обращения: 07.01.2025).

11. FIFA World Cup trophy: Lost and found – history and evolution of the most coveted prize in football. – URL: https://olympics.com/en/news/fifa-world-cup-trophy-jules-rimet-history (date of access: 04.01.2025).

12. Vonnard, P. Jules Rimet: FIFA’s Missionary President / P. Vonnard, G. Quin // Global Sport Leaders. A Biographical Analysis of International Sport Management. – Lausanne : Palgrave Macmillan, 2018. – P. 83106.

13. Tomlinson, A. FIFA and the men who made it / A. Tomlinson // Soccer & Society. – 2000. – Vol. 1, iss. 1. – P. 55–71.

14. Мундиали придумал католик-идеалист, никогда не игравший в футбол. Ему хотели дать Нобеля, но помешала дружба с фашистами. – URL: https://www.ua-football.com/foreign/-worldcup/1668724707-mundiali-pridumal-katolik-idealist-nikogda-ne-igravshiy-futbol-emu-hoteli-dat-nobelya-no-pomeshalo-sotrudnichestvo-s-fashistami.html (дата обращения: 07.01.2025).

15. Жюль Риме: не любил футбол, ругался с Кубертеном и FA, был ультрарелигиозным социалистом и придумал ЧМ. – URL: https://moscow-piter.mirtesen.ru/blog/43781432973/ZHyul-Rime-ne-lyubil-futbol-rugalsya-s-Kubertenom-i-FA-byil-ultr (дата обращения: 07.01.2025).

REFERENCES

1. Jules Rimet (1873–1956) : Quick Reference. – URL: https://www.oxfordreference.com/-display/10.1093/oi/authority.20110803100421729 (date of access: 04.01.2025).

2. Pioneers of Sport: Jules Rimet. – URL: https://admiralsports.com/blogs/journal/pioneers-of-sport-jules-rimet?srsltid=AfmBOopCku7HtbG3X6BN2VzhxWep_cnCkMv40m2kLwTy-bKOhSC-kogK9 (date of access: 04.01.2025).

3. Lyukevich, U. P. Filasofiya futbola. Prezidehnty FIFA. Deniel Vulfal / U. P. Lyukevich // Vesnik Brestskaga universiteta. Seryya 1, Filasofiya. Palitalogiya. Satsyyalogiya. – 2024. – № 2. – S. 20–26.

4. Lyukevich, U. P. Filasofiya futbola. Prezidenty FIFA. Raber Geren / U. P. Lyukevich // Tsennosti, traditsii i novatsii sovremennogo sporta : materialy III Mezhdunar. nauch. kongr., Minsk, 14–15 noyab. 2024 g. : v 3 ch. / Belorus. gos. un-t fiz. kul'tury ; redkol.: S. B. Repkin (gl. red.), T. A. Morozevich-Shilyuk (zam. gl. red.) [i dr.]. – Minsk : BGUFK, 2024. – Ch. 3. – S. 245–250.

5. Father of the World Cup. – URL: https://we.sflep.com/kewei/readingdetail.aspx?id=15112 (date of access: 05.01.2025).

6. D'Amado, L. Montevideo 1930: reassessing the selection of the first World Cup host / L. D'Amado. – URL: https://www.academia.edu/43630610/Montevideo_1930_reassessing_the_-selection_of_the_first_World_Cup_host (date of access: 05.01.2025).7.

7. Rime Zhyul'. – URL: https://bigenc.ru/c/rime-zhiul-a9f696 (data obrashcheniya: 07.01.2025).

8. Zhyul' Rime i ego vklad v razvitie futbola. – URL: https://dzen.ru/a/ZJGHn_zsmg-UPiZh2 (data obrashcheniya: 07.01.2024).

9. Dietschy, P. Making football global? FIFA, Europe, and the non-European football world, 1912–74 / P. Dietschy // Journal of Global History. – 2013. – Vol. 8, iss. 2. – P. 279–298.

10. Pechal'nyi itog istorii futbol'nogo Kubka Zhyulya Rime – byl spasen vo vremya voiny i bessledno ischez v mirnoe vremya... – URL: https://dzen.ru/a/ZWid_Hh3Okg64LYT (data obrashcheniya: 07.01.2025).

11. FIFA World Cup trophy: Lost and found – history and evolution of the most coveted prize in football. – URL: https://olympics.com/en/news/fifa-world-cup-trophy-jules-rimet-history (date of access: 04.01.2025).

12. Vonnard, P. Jules Rimet: FIFA's Missionary President / P. Vonnard, G. Quin // Global Sport Leaders. A Biographical Analysis of International Sport Management. – Lausanne : Palgrave Mac-millan, 2018. – P. 83106.

13. Tomlinson, A. FIFA and the men who made it / A. Tomlinson // Soccer & Society. – 2000. – Vol. 1, iss. 1. – P. 55–71.

14. Mundiali pridumal katolik-idealist, nikogda ne igravshii v futbol. Emu khoteli dat' Nobelya, no pomeshala druzhba s fashistami. – URL: https://www.ua-football.com/foreign/worldcup/-1668724707-mundiali-pridumal-katolik-idealist-nikogda-ne-igravshiy-futbol-emu-hoteli-dat-nobelya-no-pomeshalo-sotrudnichestvo-s-fashistami.html (data obrashcheniya: 07.01.2025).

15. Zhyul' Rime: ne lyubil futbol, rugalsya s Kubertenom i FA, byl ul'trareligioznym sotsialistom i pridumal ChM. – URL: https://moscow-piter.mirtesen.ru/blog/43781432973/ZHyul-Rime-ne-lyubil-futbol-rugalsya-s-Kubertenom-i-FA-byil-ultr (data obrashcheniya: 07.01.2025).

*Рукапіс паступіў у рэдакцыю 29.07.2025*